


# Вікі-дапаможнік

*Кіруй ведамі!*

афіцыйны правапіс

falanster.by

# Змест

Як працуе Вікіпедыя.......**4**
Уліковы запіс удзельніка.......**10**
Інтэрфейс.......**15**
Стварэнне артыкулаў.......**19**
Вікі-разметка.......**28**
Загрузка медыяфайлаў (праект Wikimedia Commons).......**32**
Як кантактаваць з вікі-супольнасцю Беларусі.......**40**
Ліцэнзіі матэрыялаў Вікіпедыі CC BY-SA.......**42**
Кантакты.......**46**


Вітаю! Мяне завуць Вікі.
Я карыстаюся Вікіпедыяй, калі трэба даведацца болей пра нешта. Але мне цікава ведаць, хто піша гэтыя артыкулы? Я чула, што кожны можа правіць Вікіпедыю, ці магу я таксама гэта рабіць? Якім чынам?
Вікі
«Уявіце свет, дзе кожны чалавек мае свабодны доступ да ўсіх ведаў чалавецтва!»
Джымі Ўэйлз

# Як працуе Вікіпедыя

## Што такое Вікіпедыя наогул, па якіх прынцыпах працуе

**Вікіпедыя** (па-англійску: *Wikipedia*; *вікі* (тэхналогія супольнага стварэння сайтаў – ад *wiki* < *анг. quick 'хутка'*) + *энцыклапедыя*) – шматмоўная агульнадаступная Інтэрнэт-энцыклапедыя свабоднага распаўсюджвання, якую ствараюць супольнай працай добраахвотныя аўтары і каардынуе некамерцыйная арганізацыя **Фонд Вікімедыя**, якая знаходзіцца ў **Сан-Францыска (Каліфорнія, ЗША)**. Распачатая **Джымі Ўэйлзам** і **Лэры Сэнгерам** у 2001 годзе, Вікіпедыя з'яўляецца буйнейшым і папулярнейшым даведнікам у Інтэрнэце і надзвычай хутка развіваецца.

Вікіпедысты ствараюць буйнейшую базу свабодных ведаў у свеце.

Усё, што ёсць у Вікіпедыі, было напісанае такімі ж людзьмі, як вы. І насамрэч Вікіпедыя не працягне заставацца найбуйнейшай онлайн-энцыклапедыяй у свеце без людзей, якія будуць рабіць далейшы ўклад інфармацыі, выяў і звестак.

Вялікая колькасць удзельнікаў Вікіпедыі імкнецца забяспечыць веды кожнаму бескаштоўна. Людзі з усяго свету ахвяруюць свой вольны час дзеля захавання і паляпшэння якасці артыкулаў у Вікіпедыі.

**Вікіпедыя дае кожнаму магчымасць свабодна абменьвацца ведамі.**

Знайшлі памылку і маеце што дадаць да артыкулу? Будзьце рашучымі!

Асноўныя прынцыпы, на якіх заснавана Вікіпедыя, былі гістарычна абагульнены суполкай рэдактараў у **пяць «слупоў»**:

Сіні слуп (1: Энцыклапедыя) **Вікіпедыя – гэта энцыклапедыя**, якая ўвабрала ў сябе элементы агульных і спецыялізаваных энцыклапедыяў, альманахаў і геаграфічных даведнікаў. Змест мусіць быць пацверджаны цытатамі з крыніцаў, вартых даверу. Вікіпедыя – ня месца для публікацыі асабістых меркаванняў удзельнікаў, асабістага досведу або ўласных перакананняў.

Зялёны слуп (2: НПГ) **Вікіпедыя трымаецца нейтральнага пункту гледжання.** Гэта значыць, што мы імкнёмся рабіць артыкулы, якія не абараняюць нейкі пэўны пункт гледжання. Часам гэта значыць прадстаўленне некалькіх пунктаў гледжання; дакладнага апісання кожнага з іх; тлумачэння кантэксту для кожнага з іх, каб чытач разумеў, чый гэта пункт гледжання; і не прадстаўленне ніводнага з пунктаў гледжання як «праўды» або «найлепшага погляду».

Жоўты слуп (3: Вольны) **Вікіпедыя складаецца са свабоднага зместу**, які кожны можа рэдагаваць і распаўсюджваць. У сувязі з вольным ліцэнзаваннем усяго зместу Вікіпедыі, ніводны ўдзельнік не можа перашкаджаць рэдагаванню і распаўсюджванню артыкулаў. Адпаведна, усё, што вы напішаце, можа без абмежаванняў правіцца і распаўсюджвацца супольнасцю. У той жа час трэба заўсёды памятаць пра аўтарскае права і паважаць яго.

Аранжавы слуп (4: Ветлівасць) **У Вікіпедыі трэба трымацца правілаў паводзін,** паважайце вашых калег з Вікіпедыі, нават калі нязгодныя з імі. Будзьце культурнымі, не пераходзьце на асобы і не абагульняйце празмерна. Заставайцеся спакойнымі, нават калі атмасфера напальваецца, заўсёды шукайце кампраміс. Будзьце адкрытымі і ветлівымі.

Чырвоны слуп (5: Ігнаруйце ўсе правілы) **Вікіпедыя не мае цвёрдых правілаў**, апроч пяці агульных прынцыпаў, выкладзеных тут. Смела праўце, пераносьце, апрацоўвайце артыкулы, радасць творчасці ў тым, што дасканаласць не патрабуецца, хоць і вітаецца. Не хвалюйцеся, што нешта папсуеце.
**Гэта пяты і самы важны слуп!**

Кароткая спасылка

Вікіпедыя:Пяць слупоў

Выкарыстоўвайце кароткія спасылкі праз вакно **«Знайсці»**. Напр., ***Катэгорыя:Біялогія, Вікіпедыя:Вікідапаможнік***

*Але хто вырашае, што будзе апублікавана? Галоўны рэдактар ці хтосьці іншы?*

**Змяняць наяўныя артыкулы ў Вікіпедыі можа кожны, хто мае доступ да Інтэрнэту. Кожны ўдзельнік Вікіпедыі працуе на развіццё супольнасці.** І вы можаце выступіць у ролі, якая вам больш цікавая ў Вікіпедыі:

**РЭДАКТАР**

*Дадае інфармацыю да артыкулаў* з кнігаў, вэб-сайтаў, газетаў і іншых крыніцаў, якія заслугоўваюць давер. Таксама ініцыюе стварэнне новых артыкулаў. Структуруе альбо вікіфікуе артыкулы, выкарыстоўваючы вікі-разметку, якую лягчэй чытаць.

**КАРЭКТАР**

*Паляпшае наяўныя артыкулы*, выпраўляе граматыку і стылістыку артыкулаў.

**ПАЧАТКОВЕЦ**

*Робіць дробныя выпраўленні*. Напрыклад, выпраўляе напісанне словаў. Таксама ён прапаноўвае шляхі паляпшэння артыкулу, паведамляючы пра гэта на старонцы абмеркавання артыкулу.

**ІЛЮСТРАТАР**

*Загружае малюнкі, фотаздымкі*, мапы і візуальныя дапаможнікі, якія маюць дачыненне да артыкулу, пры гэтым не забываючыся пра аўтарскія правы графічных матэрыялаў.

### ДАГЛЯДЧЫК

*Выяўляе артыкулы з недахопамі і выпраўляе іх, назірае за зменамі ўнесенымі іншымі ўдзельнікамі.* Ставіць запыты на крыніцы сцвярджэнняў, выдаляе не пацверджаныя крыніцамі або неверагодныя сцвярджэнні з артыкулаў, сочыць за нейтральнасцю зместу.

### АДМІНІСТРАТАР

*Мае права абараняць і выдаляць старонкі.* А таксама мае адказнасць – актыўна ўдзельнічаць у развіцці Вікіпедыі любымі іншымі спосабамі.

### МЭДЫЯ-АКТЫВІСТ

*Піша пра навіны і падзеі Вікіпедыі* дзеля пашырэння яе вядомасці і разумення.

### ПЕРАКЛАДЧЫК

*Перакладае артыкулы* з іншых моўных версіяў на беларускую мову; ці пашырае веды пра Беларусь на іншых мовах.

### АРГАНІЗАТАР ПАДЗЕЯЎ

*Ладзіць імпрэзы,* накіраваныя на развіццё Вікіпедыі, узмацненне і пашырэнне вікі-супольнасці.

Ролі нікім не рэгламентаваныя і не абмежаваныя. Можна прыдумаць свае карысныя для Вікіпедыі справы.

# Уліковы запіс удзельніка



*Я хачу дапамагчы людзям атрымаць вольны і бясплатны доступ да ведаў. Распавядзі мне больш. З чаго мне пачаць?*

Стварэнне **ўліковага запісу ўдзельніка** – добры першы крок, калі вы пачынаеце рабіць унёсак у Вікіпедыю. Уліковы запіс (акаўнт) дазваляе вам:

- ствараць новыя артыкулы;
- загружаць выявы;
- пераносіць старонкі.

Вы таксама атрымаеце доступ да спецыяльных функцыяў, такіх, як «**Мой спіс назірання**». Спіс назірання дазваляе вам сачыць за артыкуламі, якія вы адрэдагавалі і/або паставілі пазнаку цікавасці да старонкі. Каб дадаць артыкул у спіс назірання, націсніце на значок-зорачку ў верхняй частцы артыкулу.

Што яшчэ больш важна, такім чынам усе вашыя змены ў артыкулах Вікіпедыі запісваюцца пад імем вашага ўліковага запісу, ідэнтыфікуючы вашую дзейнасць у Вікіпедыі. Гэта дапаможа вам узаемадзеяць з іншымі людзьмі, якія рэдагуюць тыя ж артыкулы, што і вы, і стаць надзейным **сябрам супольнасці**.

Калі вы прызвычаіцеся да Вікіпедыі, то выявіце, што будзеце здольныя ўдзельнічаць у дыскусіях, і зможаце дапамагчы іншым у рэдагаванні артыкулаў.

## Рэдагаванне без рэгістрацыі

Вы можаце рэдагаваць Вікіпедыю без рэгістрацыі. Тым не менш, без выкарыстання ўліковага запісу вашыя выпраўленні будуць запісвацца пад вашым IP-адрасам. Практыка сведчыць пра тое, што **супольнасць Вікіпедыі схільная не давяраць выпраўленням ананімаў.**

Калі вы забыліся, як нешта зрабіць у Вікіпедыі, знайдзіце любы артыкул, які ўтрымлівае тое, што вы жадаеце дадаць. Націснуўшы **«Правіць зыходнік»**, вы пяройдзеце на старонку рэдагавання вікі-тэксту і ўбачыце, як пабудаваны іншы артыкул. Па аналогіі зможаце адрэдагаваць свой.

# Як стварыць уліковы запіс

Стварыць уліковы запіс у Вікіпедыі вельмі лёгка:

- Націсніце на «**Стварыць уліковы запіс**»
у правым верхнім куце старонкі.
- Запоўніце поле «**Імя ўдзельніка**»
(можна выкарыстаць нік).
- Абярыце сабе пароль.
- Націсніце на спасылку «**Стварыць уліковы запіс**».




Калі вы ствараеце ўліковы запіс удзельніка, лепш запоўніць поле «Адрас электроннай пошты».
У гэтым выпадку вы зможаце аднавіць свой пароль, калі забудзеце яго.

*Гэта было хутка!*
*Цяпер я маю акаўнт і магу ствараць якасныя артыкулы.*




## Асабістая старонка ўдзельніка

Дадаць інфармацыю пра сябе і свае зацікаўленасці можна на вашай старонцы ўдзельніка. Кожны ўліковы запіс мае старонку ўдзельніка і старонку размоў да яе. Вы можаце знайсці спасылкі на сваю старонку і размовы **ў правым верхнім вуглу экрана**. Каб перайсці на сваю старонку ўдзельніка, націсніце на сваё імя ўдзельніка, якое знаходзіцца побач са значком удзельніка. Потым націсніце на закладку **«Правіць зыходнік»**, каб напісаць пра сябе. Калі скончыце пісаць пра сябе, націсніце кнопку **«Запісаць»** пад акном рэдагавання.

Вы можаце напісаць пра сябе, свае спецыяльныя веды, пазначыць свае зацікаўленасці, у прыватнасці прыхільнасць да пэўнай тэматыкі або артыкулаў.

На старонцы карыстальніка можна размяшчаць розныя **шаблоны**, якія робяць профіль больш інфарматыўным.
Напрыклад, шаблон {{удзельнік-даглядчык}} паказвае прыналежнасць да дакладнай групы ўдзельнікаў.

# Зносіны з іншымі ўдзельнікамі Вікіпедыі праз старонку «Размовы з удзельнікам»

Старонка размоў удзельніка – гэта месца, дзе вы і іншыя ўдзельнікі маюць магчымасць пакідаць паведамленні, на якія можна адказваць. Многія ўдзельнікі пакідаюць прывітанні для новых карыстальнікаў. Іншыя вікіпедысты могуць выкарыстоўваць гэтую прастору, каб пачаць размову, пазнаёміцца з вамі лепей і зразумець змены, якія вы зрабілі ў артыкулах.

- Шаблон {{Babel}} паказвае ўзровень валодання аўтарам пэўнымі мовамі. Напр., {{#babel:be-N|ru-4|uk-4|en-2|bg-1|it-1}}
- Часам вікіпедысты ставяць шаблоны, якія адлюстроўваюць статыстыку, напр., {{Славянскія раздзелы Вікіпедыі}} і {{Змаганне Вікіпедый}}, або спіс заданняў: {{Заданні для ўдзельнікаў}}.

*О, хтосьці пакінуў паведамленне на маёй старонцы размоў.*
*У ім тлумачыцца, што мае праўкі былі адменены, бо яны падаліся неправдападобнымі.*
*З прычыны таго, што факт, які я дадала, заснаваны на паведамленні з вэб-сайта ўрада, я аднаўлю праўкі. Гэтым разам уключу крыніцу ў раздзел спасылак у канцы артыкула.*

# Карыстальніцкі інтэрфейс






**«Даведка»** дазволіць вам даведацца больш пра тое, як працуе Вікіпедыя.

У «**Апошніх зменах»** ёсць спіс зменаў, якія былі зробленыя ва ўсіх артыкулах Вікіпедыі ў храналагічным парадку. Гэтая старонка дазваляе выяўляць артыкулы з памылкамі і акты вандалізму.

**«Інтэрвікі» (На іншых мовах).** Гэта функцыя звязвае адзін артыкул на розных мовах. Вікіпедыя існуе на больш як на 280 мовах.

З дапамогай «**Знайсці»** вы знойдзеце артыкул паводле вашага запыту. Калі артыкул яшчэ не існуе, будзе адлюстраваны спіс артыкулаў, у якіх гэтае слова прысутнічае.

**«Стварыць уліковы запіс»** ў верхнім правым куце старонкі дае вам доступ да ўсіх прыладаў Вікіпедыі і дапамагае стварыць свой онлайнавы акаўнт.

**«Форум»** – гэта адмысловае месца для камунікацый удзельнікаў вікіпедыйнай супольнасці. Тут вы можаце абмеркаваць тэхнічныя і арганізацыйныя пытанні Вікіпедыі.

# Закладкі на старонцы артыкулу

Асноўныя панэлі дзеянняў з артыкулам змяшчаюцца ўверсе справа.

Панэль **«Правіць»**. Заўважылі недарэчнасці?
Будзьце рашучымі – націсніце на панэль і палепшыце артыкул.




Панэль **«Правіць зыходнік»**. Клікнуўшы на панэль, вы атрымаеце пашыраныя магчымасці рэдагавання, трапіўшы ў крынічны код вікі-разметкі, якая мала чым адрозніваецца ад стандартнага HTML-коду. Прыклады працы з кодам глядзіце ніжэй.




Даведайцеся больш – націсніце **«Гісторыя»** і высветліце, як артыкул развіваўся да цяперашняга стану. Старонка гісторыі таксама дазваляе праглядзець і параўнаць мінулыя версіі артыкулу.



Старонка **«Размовы»** з'яўляецца месцам для абмеркавання аўтарамі і іншымі ўдзельнікамі планаў, датычных структуры артыкулу. Тут адбываюцца размовы і дасягненні кансэнсусу адносна зместу артыкулу.
Гэта месца, дзе можна папрасіць дапамогі ў пытанні, звязаным з гэтым артыкулам.
Таксама, калі вы не хочаце дапісваць артыкул самастойна, націсніце «Размовы» і напішыце свае ідэі ды прапановы на старонцы гутарак.

*Я мару пра паляпшэнне якога-небудзь артыкулу, які потым з'явіцца на галоўнай старонцы вэб-сайту з мільёнамі чытачоў.*






# Стварэнне артыкулаў

**Шмат аб’ектаў, асоб і тэм** пакуль незакранутыя Вікіпедыяй, і вы можаце напісаць пра іх артыкулы. Пашукайце і ўпэўніцеся, што артыкула пра ваш аб’ект яшчэ няма – шукайце пад рознымі магчымымі варыянтамі назвы або імя (сінонімамі). Таксама наяўнасць артыкула можна праверыць у артыкулах сумежнай тэматыкі. Спасылка на востраў можа быць у артыкуле пра краіну, якой ён належыць.

Ацаніце, ці настолькі аб’ект або асоба значныя, каб пісаць пра іх артыкул у энцыклапедыі. Напрыклад, пра музычны гурт з суседняга гаража ствараць артыкул пакуль не варта.

Калі артыкул пра пажаданы аб’ект знайшоўся, гэта таксама добра – дадайце туды сваю інфармацыю, прынамсі, свой варыянт назвы. **Не знайшоўся – стварайце яго!**

Кароткая спасылка

ВП:АК

Дапільнуйце, каб замест кірылічных літараў **а, В, е, і, К, М, о, р, с, Т, у, х, Н** у тэкст не трапілі адпаведныя лацінічныя.

# Агляд крыніц па тэме артыкулу

**Артыкулы Вікіпедыі павінны грунтавацца на надзейных, бесстаронніх, апублікаваных крыніцах з рэпутацыяй хуткаправяральных і дакладных.** Гэта азначае, што Вікіпедыя змяшчае меркаванні толькі вартых даверу аўтараў, а не погляды вікіпедыстаў, якія прачыталі матэрыял і інтэрпрэтавалі яго на свой лад.

Слова ***крыніца*** мае ў Вікіпедыі тры значэнні:

- уласна частку твору (артыкулу, даследавання, дакументу, кнігі);
- аўтара твору (напрыклад, пісьменніка);
- выдаўца твору  (напрыклад, «Наша Ніва» ці выдавецтва «Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі»).

Усе тры пералічаныя чыннікі могуць уплываць на ўзровень надзейнасці крыніцы. З гэтай прычыны вартымі даверу крыніцамі могуць быць апублікаваныя матэрыялы з вартым даверу працэсам апублікавання; гэта могуць быць і аўтары, якія заслужылі аўтарытэт у апісанні асобы, пра якую вядзецца гаворка; або і першае, і другое.

Калі вы жадаеце дадаць новы артыкул, варта пашукаць адпаведныя крыніцы, што будуць утрымліваць тую інфармацыю, якую будзе раскрываць артыкул. **Як мінімум, варта знайсці дзве крыніцы, а лепей – чатыры-пяць.**

# Стварэнне новага артыкулу



**Перад даданнем артыкулу абавязкова паглядзіце, ці існуе ўжо такі**, выкарыстоўваючы сінанімічныя назвы ў пошуку. Гэта можна зрабіць у стандартным пошукавіку або праз убудаваны пошук у Вікіпедыі.

**Калі артыкул ужо існуе**, магчыма, вы можаце дадаць новыя звесткі, дапоўніць ці скарэктаваць існы артыкул. **Калі артыкул не існуе**, вы пабачыце загаловак артыкулу ў выглядзе **чырвонай спасылкі**. Націсніце на яе, і адчыніцца вакно стварэння новага артыкулу.

На старонцы рэдагавання вы можаце смела пісаць тэкст артыкулу (можаце загадзя падрыхтаваць тэкст, напрыклад, у нататніку, і потым толькі перанесці ды аформіць яго на старонцы стварэння). Не забывайцеся націскаць **«Запісаць»** пасля сканчэння чарговага рэдагавання (перад захаваннем зменаў можна націснуць на **«Як будзе»**, каб убачыць, як старонка будзе выглядаць пасля захавання).

Артыкулы, меншыя за 3 тысячы знакаў, лічацца **накідамі**. Такія артыкулы маюць права на існаванне, але патрабуюць развіцця.

Калі артыкул не раскрывае зместу з'явы, аб'екту, падзеі, яго могуць хутка выдаліць. Каб такога не здарылася, паляпшайце свой артыкул і выкарыстоўвайце шаблон **{{Пішу}}**. Таксама не адмаўляйцеся ад адстойвання права артыкула на існаванне ў выпадку, калі яму будзе пагражаць выдаленне.

Каб зрабіць тэкст лёгкім і зручным для чытання на старонках Вікіпедыі, неабходна азнаёміцца і вывучыць базавыя правілы **вікі-фарматавання** *(глядзіце раздзел «Вікі-разметка»)*.

Таксама праглядзіце, як афармленыя і пабудаваныя артыкулы на тэмы, блізкія да вашай, і адфарматуйце свой падобным чынам.

Па магчымасці дадайце ў артыкул спасылкі на іншыя існыя артыкулы Вікіпедыі (імёны, назвы, з’явы). Менавіта на гіперспасылках і пабудаваная праца, пошук і распаўсюд ведаў у Вікіпедыі.

**Ваш новы артыкул будзе добры, калі вы будзеце памятаць пра тры пункты:**

- апісанне з’явы, падзеі, асобы;
- прычына значнасці абранай тэмы;
- спасылкі на надзейныя крыніцы інфармацыі па тэме.

Выкарыстоўвайце **шаблон {{Пішу}}**, калі актыўна займаецеся артыкулам. Гэта паслужыць сігналам іншым вікіпедыстам, што трэба пачакаць з яго актыўным выпраўленнем.

Кароткая спасылка

Вікіпедыя:Як ствараць артыкул

# Для перфекцыяністаў

Яшчэ адзін варыянт стварэння артыкулу – скарыстацца **«Чарнавіком»**. Рабіце сваю працу там датуль, пакуль артыкул не будзе ўтрымліваць тры вышэй азначаныя элементы.

Каб трапіць у «Чарнавік», вам неабходна яго стварыць. Назва старонкі павінна мець наступны выгляд **Удзельнік:Імя вашага ўліковага запісу/Чарнавік**.

Можаце карыстацца гэтай старонкай, каб захоўваць на ёй сваю чарнавую працу. Калі вы цалкам скончылі сваю працу над артыкулам, знайдзіце іншага ўдзельніка, якому будзе цікавая гэтая тэма, з запытам прарэцэнзаваць створаны вамі артыкул.

Пасля гэтага скарыстайцеся спасылкай «**Перанесці**», якая месціцца ў выпадаючым меню каля поля пошуку, каб перанесці змест вашага чарнавіку ў адпаведны артыкул Вікіпедыі.

На старонцы, якая ў выніку адчыніцца, абярыце элемент **«(Артыкулы)»** у выпадаючым спісе **«Пад новую назву»**, пасля ўвядзіце адпаведную назву для артыкулу замест назвы вашага чарнавіку і націсніце на кнопку «**Перанесці старонку**».

Цяпер ваш артыкул у асноўнай прасторы Вікіпедыі.



Калі назва артыкулу складаецца з некалькіх словаў, **першая літара першага слова** заўжды вялікая, астатнія словы – праз прагал з малой літары (напр., *Таварыства беларускай школы*).

**Назоўны склон, адзіночны лік.** Акрамя выпадкаў, калі слова мае толькі множную форму, калі мае сэнс адрозніць артыкул пра адзін аб'ект і пра сукупнасць, групу аб'ектаў.



**Замежныя імёны і назвы** пажадана падаваць у беларускім напісанні *(Джордж Бернард Шоу, а не George Bernard Shaw)*. Калі няма агульнапрынятага беларускага адпаведніка, можна пісаць арыгінальную форму, але на пачатку артыкулу (у дужках) пажадана даць прыклад вымаўлення: *Linux (лінукс)*.

Калі назва адпавядае **некалькім (розным) сэнсам**, з'явам, аб'ектам – варта стварыць адну абагульняльную старонку з гэтай назвай і пералічыць там спасылкі на больш дэталёвыя артыкулы. Назвы такіх старонак складаюцца з агульнай назвы плюс удакладненне ў круглых дужках. Напрыклад, агульны артыкул: *Сістэма* можа спасылацца на *Сістэма, паліталогія*; *Сістэма, матэматыка* і да т. п.

Назвы артыкулаў пра нейкі **твор** – без двукосся і без удакладняльнага слова: *Песня пра зубра*, а не *паэма Песня пра зубра* і не *«Песня пра зубра»*.

Не трэба закладаць у назву **іерархію** паняткаў, напрыклад: *Зборная Беларусі па хакеі*, а не *Беларускі хакей: зборная*.

Не трэба ўжываць у назве розныя **службовыя сімвалы** кшталту |, *, &, +, {, }, [, ].

## Узорная структура добрага артыкулу

**Добрыя і выдатныя артыкулы** – тыя артыкулы, да ўзроўню якасці якіх варта імкнуцца пры напісанні свайго артыкулу. Напр., **добрыя артыкулы** павінны мець адносна высокі ўзровень якасці, але, у адрозненне ад **выдатных артыкулаў**, усе патрабаванні да іх носяць больш мяккі характар.

У дадатак да агульных правілаў, датычных артыкулаў Вікіпедыі, добрыя артыкулы павінны быць:

- **якасна складзенымі і арыгінальнымі:** напісанымі для Вікіпедыі, а не скапіраванымі аднекуль; мова і стыль напісання павінны быць на добрым узроўні і не ўтрымліваць відавочных памылак;
- **поўнымі:** раскрываць тэму ў поўным аб’ёме, улічваць самыя значныя факты і меркаванні;
- **добра прапрацаванымі:** адлюстроўваць старанны і рэпрэзентатыўны агляд асноўнай літаратуры па тэме, калі большасць самых значных сцверджанняў можа быць праверана ў якасных і надзейных крыніцах, утрымліваць спіс літаратуры і зноскі.

- **утрымліваць зноскі на крыніцы інфармацыі** асноўных тэзісаў, фактаў, сцверджанняў, якія могуць выклікаць недавер, а таксама ацэначных меркаванняў па тэме артыкулу;
- **нейтральнымі:** прадстаўляць меркаванні справядліва і непрадузята;
- **стабільнымі:** калі змест артыкулу не з'яўляецца тэмай спрэчак і ў ім не вядзецца «вайны выпраўленняў»;
- **з уводзінамі:** утрымліваць мінімум 3–4 сказы ўводзінаў, якія коратка раскрываюць тэму артыкулу;
- **структураванымі:** мець добра структураваную іерархію раздзелаў;
- **ілюстраванымі выявамі толькі з ясным ліцэнзійным статусам:** павінны ўтрымліваць толькі вольныя выявы і/ці абгрунтаваную, мінімальна неабходную колькасць fair-use выяваў, якія адпавядаюць крытэрам добрапрыстойнага карыстання;
- **завершанымі:** не ўтрымліваць яўна недапісаных раздзелаў;
- **суаднесенымі катэгарыяльна:** мець катэгорыі і інтэрвікі.

## Што рабіць пасля стварэння артыкулу



- **Стварыць перасылкі** на назву створанага артыкулу, калі гэта патрабуецца.

Напр.:  артыкул створаны пад асноўнай назвай *«Янка Купала»*, дарэчным будзе стварыць перасылку на яго з *«Іван Луцэвіч»*.

- Націснуць на экране злева ад навастворанага артыкулу «**Дадаць спасылкі**» і паставіць спасылку на адпаведнік артыкулу з вядомай вам мовы (калі адпаведнік існуе ў іншым моўным раздзеле). Гэта робіцца праз «**Інтэрвікі**» ў левай калонцы знізу.

- **Злучыць** створаны вамі артыкул з іншымі артыкуламі, у якіх згадваецца вашая тэма.

## Дадаванне катэгорыяў

**Катэгорыя** – адмысловая старонка, якая змяшчае спіс артыкулаў, што ўваходзяць у дадзеную катэгорыю. Туды трапляюць усе старонкі, у якіх пазначана гэтая катэгорыя, у алфавітным парадку. Катэгорыі адрозніваюцца ад простых артыкулаў тым, што перад іх назвай ідзе ключавое слова ***Катэгорыя***, напр.: *Катэгорыя:Беларускія літаратары*.

Катэгорыі граюць ролю **тэгаў**, якія дапамагаюць класіфікаваць артыкулы паводле тэмаў.

Перад тым, як дадаць катэгорыю, неабходна пашукаць яе праз пошук Вікіпедыі. Знайшоўшы патрэбную катэгорыю, вы можаце дадаць яе ўнізе старонкі, напр. **[[Катэгорыя:Беларускія літаратары]]**. Калі вы не знаходзіце патрэбнай катэгорыі, паспрабуйце пашукаць паводле словаў-сінонімаў. Калі ж патрэбнай катэгорыі не існуе, вы можаце яе запачаткаваць, каб іншыя ўдзельнікі таксама маглі ёй карыстацца.

Не забывайцеся дадаваць артыкул прынамсі ў адну катэгорыю, тады яго будзе лягчэй знайсці.



# Вікі-разметка

Для вылучэння, аздаблення тэксту рознымі стылямі і пазначэння структуры тэксту ў Вікіпедыі існуе спецыяльная мова фарматавання – **вікі-фарматаванне**.

У правым слупку табліцы паказваюцца магчымасці, якія можна ўжываць у артыкулах Вікіпедыі, а ў левым – тое, што трэба напісаць, каб зрабіць такое фарматаванне.




## Апісанне разметкі

Націснуўшы **«Правіць зыходнік»**, вы атрымаеце пашыраныя магчымасці ў выпраўленні артыкулаў. Вось найгалоўнейшыя інструкцыі для рэдагавання коду Вікіпедыі:

| Вікі-разметка | Выглядае як |
|---|---|
| ''курсіў'' | *курсіў* |
| '''тоўсты''' | **тоўсты** |
| '''''тоўсты курсіў''''' | ***тоўсты курсіў*** |
| == загаловак == (2 знакі раўнання)<br>=== падзагаловак === (3 знакі раўнання)<br>==== падзагаловак<br>(меншы шрыфт) ==== (4 знакі раўнання) | **загаловак**<br>**падзагаловак**<br>**падзагаловак (меншы шрыфт)** |
| [[Беларуская мова]], тэкст,<br>[[Беларуская мова\|адрозны ад спасылкі]] | Беларуская мова, тэкст, адрозны<br>ад спасылкі |
| спасылка на [[няісную яшчэ старонку]]<br>вылучаецца чырвоным колерам | спасылка на няісную яшчэ старонку<br>вылучаецца чырвоным колерам |
| спасылка на раздзел артыкулу [[Беларусь#<br>Насельніцтва\|«Насельніцтва Беларусі»]] | спасылка на раздзел артыкулу<br>«Насельніцтва Беларусі» |
| [https://www.facebook.com/<br>BelarusianWikipedia спасылка на вонкавы<br>сайт] | спасылка на вонкавы сайт |

| | |
|---|---|
| [[Катэгорыя:Войны Вялікага Княства Літоўскага]] | Артыкул будзе змешчаны ў катэгорыю «Войны Вялікага Княства Літоўскага» |
| * зрабіць спіс проста (спіс будзе маркіраваны, а не нумараваны)<br>** чым болей зорачак – глыбейшы водступ | • зрабіць спіс проста (спіс будзе маркіраваны, а не нумараваны)<br>• чым болей зорачак – глыбейшы водступ |
| # спіс з аўтаматычнай<br># нумарацыяй радкоў | 1. спіс з аўтаматычнай<br>2. нумарацыяй радкоў |
| [[Файл:Colosseum.jpg\|thumb\|250px\|Выява з подпісам]] | <br>Выява з подпісам |
| <ref>Змяшчэнне зноскі пасля тэксту </ref> | Пазначэнне крыніцы інфармацыі зноскай. Адначасова ўнізе патрэбна змясціць шаблон {{Зноскі}}. |
| {{Зноскі}} (або {{reflist}}) | Нумараваны спіс крыніцаў і зносак (дадаецца напрыканцы артыкулу) |
| --~~~~ | Ваш подпіс з датаю (дадаецца толькі ў абмеркаваннях артыкулаў) |

## Апісанне рэдактара

• Перад захаваннем рэдагавання карыстайцеся клавішай **«Як будзе»**, каб пабачыць, як артыкул будзе выглядаць пасля захавання.

• Пажадана (але не абавязкова) коратка апісваць кожнае рэдагаванне ў ваконцы пад назваю **«Тлумачэнне»**.

## Дапаможныя сродкі

• Для спрашчэння рыхтавання тэксту ў Вікіпедыі існуе адмысловая прылада – **вікіфікатар**. Вікіфікатар прызначаны для выпраўлення тыпаграфікі (расстаноўкі двукоссяў, працяжнікаў, непарыўных прагалаў і іншых знакаў паводле фармальных правілаў), афармлення тэксту і паляпшэння вікі-фарматавання.

Кароткія спасылкі на карысныя старонкі (шукаць праз пошук у Вікіпедыі)

Вікіпедыя:Вікіфарматаванне

Вікіпедыя:Афармленне артыкулаў

Вікіпедыя:Як правіць артыкул

# Загрузка медыяфайлаў (праект Wikimedia Commons)

Каб ваш артыкул быў больш інфарматыўны, вы можаце дадаць у яго выяву, відэа або гук. Уся інфармацыя ніжэй датычыцца ўсіх трох абазначаных тыпаў кантэнту.

Медыякантэнт можна дадаваць у кожным моўным раздзеле Вікіпедыі, але тады файл можна будзе ўжываць толькі ў тым моўным раздзеле, у якім ён быў створаны.

Каб адзін і той жа файл выкарыстоўваць у розных моўных раздзелах, трэба дадаць яго ў **ВікіСховішча (Wikimedia Commons)**, размешчанае па адрасе **commons.wikimedia.org** (мова сайту – англійская).



Перш за ўсё рабіце свае выявы.

# Як дадаць медыякантэнт на ВікіСховішча

- Калі вы ўжо стварылі акаўнт у Вікіпедыі, тады **залагіньцеся** ў **Wikimedia Commons**.
- **Націсніце** кнопку **Upload**.
- Адкрыецца старонка з заўвагамі, як дзеяць, каб не парушыць аўтарскіх правоў на медыякантэнт. Прачытайце. Націсніце **Next**.
- **Абярыце медыяфайл(ы)** для запампоўвання.
- Пазначце **аўтарскія правы** на файлы.
- Дадайце **назву і апісанне** медыякантэнту, дадайце катэгорыі.
- **Медыяфайл запампаваны!** Нарэшце вы можаце скапіраваць код вікі-разметкі, каб дадаць файл у ваш артыкул.

Назва выявы звычайна размяшчаецца ў левым куце. Скапіруйце яе для таго, каб размясціць на старонцы артыкулу.





This site requires you to provide copyright information for this work, to make sure everyone can legally reuse it.

**This file is my own work.**

I, Mr. Zabej, the copyright holder of this work, irrevocably grant anyone the right to use this work under the following license:

Creative Commons Attribution ShareAlike 4.0 (legal code)

Commons Attribution ShareAlike 3.0 (legal code)

Commons Attribution 4.0 (legal code)

Commons Attribution 3.0 (legal code)

Commons CC0 Waiver (release all rights, like public domain: legal code)

Магчымыя варыянты ліцэнзіяў для вашага твору ў Wikimedia Commons.

Learn | Upload | Release rights | Describe | **Use**

**Thanks for uploading!**

You can now use these files on wikis, or link to them on the web.



Белы наліў.jpg

To use the file in a wiki, copy this text into a page:

[[File:Белы наліў.jpg|thumb|These are typical belarusian apples.]]

To link to it in HTML, copy this URL:

https://commons.wikimedia.org/wiki/File:%D0%91%D0%B5%D0%BB%D1%8B_%D0%BD%D0%B0%D0%

Пасля праходжання ўсіх крокаў запампоўвання вашага кантэнту вы атрым-ліваеце магчымасць адразу скапіраваць код для свайго артыкулу.

# Загрузка выяваў

Запампоўваючы выяву, відэа або гук у Вікіпедыю, зважайце на баланс якасці, памеру і вагі файлу.

## Як правільна зрабіць выяву

Найбольш распаўсюджаныя памылкі:

- Дрэнная якасць малюнку (не бачны, расплываецца аб’ект).
- Абрэзка значных дэталяў аб’екту.
- Адцягванне ўвагі ад аб’екту прысутнасцю асоб, жывёлы ці іншых аб’ектаў.

**Увага:** выява перад запампоўваннем не павінна ўтрымліваць ніякіх вадзяных знакаў. Пажадана запампоўваць выяву без штучна напісанага тэксту.

## Як правільна даць назву файлу з выявай

Лепей замест назвы файлу *Africa.png* выкарыстоўваць больш дэталёвыя назвы, напр., *Africa political map Jan. 2012.png* або *Africa political map with red borders.png*

## Якія фарматы файлаў прыдатныя для выяваў

Найбольш распаўсюджаныя і рэкамендаваныя фарматы ў Вікіпедыі: першы паводле папулярнасці **jpeg** *(самы кампактны)* – 84 %, **png** *(зручны, калі ў вас празрыстая аснова, фон)* – 7 %, а трэці – **svg** *(зручны для мапаў і лагатыпаў)* – 5 %. Але магчымыя і іншыя незапатэнтаваныя фарматы: **pdf**, **tiff**, **ogg**, **djvu** і іншыя.

# Якія памеры файлаў аптымальныя для выяваў

Рэкамендаваны **максімальны памер** заладаванага файлу на Wikimedia Commons – **100 мегабайтаў** *(выключныя выпадкі 1 гігабайт)*, але, напр., малюнак лепей за ўсё рабіць памерам, прыдатным для прагляду аб'екту і значных дэталяў на ім (некалькі мегабайтаў).

НЕ ЗМЯШЧАЙЦЕ Ў ВІКІПЕДЫЮ ВЫЯВЫ, АЎТАРСТВА І ЎМОВАЎ РАСПАЎСЮДУ ЯКІХ ВЫ НЕ ВЕДАЕЦЕ!

# Парады па апісанні выявы

Абавязковыя палі:

- **Апісанне (Description)** – можаце спаслацца на артыкул, дзе будзеце дадаваць фота/гук/медыя, або растлумачце больш дэталёва, што і хто на фота (падзея, дата, дзейныя асобы). Апісанне на англійскай мове вельмі пажаданае.
- **Месца, дзе ўзялі (Source):** Імя ствaральніка або дакладны URL, адкуль узялі фота (пажадана шлях менавіта да выявы). Калі фота ўзялі з кнігі (часопісу), пажадана пазначыць аўтара кнігі, ISBN, назву і год выдання.
- **Аўтар (Author):** Пазначаць у любым выпадку.
- **Дазвол (Permission):** Які закон або дакумент дазваляе выкарыстанне матэрыялу.
- **Дата (Date):** Поўная дата лепей, чым проста год.

Увага! У Вікіпедыі нельга выкарыстоўваць запатэнтаваныя фарматы кшталту: MP3, AAC, WMA, MPEG і большасць AVI. Калі вы маеце кантэнт у непрымальным фармаце, пераканвертуйце файл у вольны фармат.

## Як дадаць чужую выяву

Неабходна атрымаць дазвол. Рэкамендуецца выкарыстоўваць пісьмовую форму дазволу, якую трэба даслаць на адрас: **permissions-commons@wikimedia.org**, пажадана з адрасу аўтара, або ўлучыць яго ў копію ліста.

Калі будзеце працаваць не з уласнымі выявамі, варта:

- **распавесці** аўтару, што такое Вікіпедыя;
- **пазначыць малюнак**, які вы жадаеце размясціць (са спасылкай);
- **пазначыць**, дзе вы хочаце размясціць малюнак (са спасылкай);
- **запытаць дазвол** на размяшчэнне выявы пад умовамі грамадскага набытку
або вольнай ліцэнзіі, напр., *Creative Commons Attribution Share-Alike 4.0 International;*
- на старонцы выявы **пазначыць імя аўтара**, а таксама **спасылку**, адкуль узята фота;
- аддзячыць уладальніка выявы :-)

Кароткая спасылка на прыклад:

Вікіпедыя:Атрыманне дазволаў

## Выкарыстанне выяваў



Код генеруецца пасля заліўкі выявы:
**[[Файл:Белы наліў.jpg|thumb|Так выглядаюць звычайныя беларускія яблыкі.]]**
і дадаецца самастойна ў патрэбнае месца артыкулу.

Таксама можна дадаць выяву праз панэль рэдагавання артыкулу, якая месціцца над асноўным полем уводу інфармацыі.

Назва файлу бярэцца з загалоўку на старонцы прагляду файлу.
Пасля **Файл:Белы наліў.jpg** можна смела дадаваць праз рэдактар.

## Размяшчэнне галерэі

Дзеля дадавання галерэі неабходна выкарыстаць адмысловы тэг **<gallery>**, а таксама назвы файлаў выяваў з **Wikimedia Commons**.

*Прыклад:*
**<gallery>**
Файл:Wiki.png|Подпіс 1
Файл:Wiki.png|Подпіс 2
**</gallery>**



Гэты тэг можна ўводзіць самому або праз графічны рэжым (абіраць у меню рэдагавання).




## Пошук фота, відэа, аўдыё для вашага артыкулу



- Шукайце выявы, якія знаходзяцца ў **грамадскім набытку** *(public domain)* або выкарыстоўваюць вольныя ліцэнзіі *(напр., **Creative Commons Attribution Share-Alike 4.0**)* у Сеціве.
- Шукайце выявы **на дзяржаўных сайтах**.
- Шукайце выявы ў Вікіпедыі **ў адпаведных артыкулах** на іншых мовах або заходзьце на Wikimedia Commons і корпайцеся там.
- **Матывуйце** іншых вікірэдактараў дапамагчы вам.

Калі вы не знайшлі выяву, але вельмі хочацца размясціць, **пастаўце заглушку**. Гэта будзе заклікам да іншых вікі-жыхароў дапамагчы пашукаць, або распачніце на старонцы абмеркавання тэму пошуку выявы.

# Як кантактаваць з вікі-супольнасцю Беларусі





**Група карыстальнікаў Вікіпедыі**
– гэта арганізаваная супольнасць вікіпедыстаў, якія жадаюць узаемадзеяць для больш актыўнага і эфектыўнага развіцця ведаў на беларускай мове.

| | |
|---|---|
| **Раздзелы беларускай Вікіпедыі існуюць двума правапісамі:** | |
| **класічны *(тарашкевіца)*** – be-tarask.wikipedia.org | **афіцыйны *(наркамаўка)*** – be.wikipedia.org |
| **Спіс рассылак юзергрупы** – *Тут апошнія навіны, цікавыя і карысныя спасылкі.* | |
| http://falanster.info/mailman/listinfo/wikification | |
| **Скайп-чаты** *(Калі жадаеце далучыцца да скайп-чатаў, пішыце ў мэйлінг ліст)* | |
| **Групы ў «Фэйсбуку»** | |
| facebook.com/BelarusianWikipedia | facebook.com/be.wikipedia |
| **Групы «Ўкантакце»** | |
| vk.com/belarusianwikipedia | vk.com/be.wikipedia |
| **Туітэр** | |
| twitter.com/Wikipedyja | twitter.com/be_wikipedia |

# Ліцэнзіі матэрыялаў Вікіпедыі CC BY-SA

**Што патрэбна ведаць аб правах на ўсе творы, малюнкі, выявы і іншыя матэрыялы, якія ўжо ёсць ці якія вы цяпер размяшчаеце ў Вікіпедыі?**

Адна з умоваў карыстання Вікіпедыяй – правамерныя паводзіны.
Паводле дзейных аўтарскіх правоў і іншых законаў можна:

- **чытаць і раздрукоўваць** артыкулы і іншыя медыя бескаштоўна;
- **рабіць унёсак і рэдагаваць** розныя сайты і праекты Вікімедыі;
- **дзяліцца, распаўсюджваць і выкарыстоўваць** артыкулы і іншыя медыя пад вольнымі і адкрытымі ліцэнзіямі.

**Патрэбна:**
ліцэнзаваць увесь ваш унёсак і змены на сайтах або праектах пад вольнай і адкрытай ліцэнзіяй *(калі ваш унёсак не ў грамадскім набытку).*

## Чаму гэта важна?

Каб расло багацце вольных ведаў і свабоднай культуры, усе карыстальнікі, якія ўдзельнічаюць у Вікіпедыі, павінны прадстаўляць шырокія правы на свае творы грамадскасці, каб можна было

- паўторна распаўсюджваць і
- паўторна выкарыстоўваць унёсак свабодна,

так, каб такое выкарыстанне было належным чынам

- прыпісана да аўтара і
- каб была такая ж свабода паўторнага выкарыстання і паўторнага распаўсюджвання любых вытворных твораў.

**Менавіта таму абраныя вольныя ліцэнзійныя дагаворы,** умовы якіх найлепшым чынам адпавядаюць гэтай мэце.

*Што ж, час бяжыць. Я толькі што націснула на спасылку «Ўклад» уверсе старонкі і выявіла, што зрабіла ўжо больш за 100 рэдагаванняў.*

*Я атрымала вялікае задавальненне праз камунікацыю з іншымі вікіпедыстамі, напісанне якасных артыкулаў і распаўсюджванне ведаў, якія ўсім дасяжныя бясплатна.*

# Што такое вольныя ліцэнзіі?



Калі ваш тэкст, малюнак, фота ахоўваюцца аўтарскім правам (ёсць творамі) і вы маеце на іх аўтарскія правы, вы дадаяце іх на ўмовах ліцэнзіі **Creative Commons Attribution-ShareAlike** *(«CC BY-SA»)* і **GNU Free Documentation License** *(«GNU FDL»)*.

Значэнне літараў ліцэнзіі Creative Commons:

**CC – Creative Commons – Творчыя суполкі.** Адно з найбольш вядомых сямействаў публічных ліцэнзіяў, якія дазваляюць выкарыстоўваць творы, якія ахоўваюцца аўтарскім правам, у Інтэрнэце.

**BY – Attribution – Прызначэнне аўтарства (Атрыбуцыя).** Гэта вельмі значная частка ліцэнзіяў. Тут мусіць пазначацца аўтар твору. Калі вы ствараеце тэкст, вы згодныя на тое, што вашае аўтарства будзе пазначанае, часцей за ўсё праз гіперспасылку (URL). Кожны артыкул мае старонку гісторыі, дзе пералічваюцца ўсе аўтары і рэдактары. Таксама, устаўляючы чужы тэкст, вы павінны пазначыць аўтара (аўтараў) гэтага тэксту.

**SA – Share Alike – (Распаўсюд) на тых жа ўмовах.** Усё, што змяняецца, ствараецца на матэрыяле, які знаходзіцца пад вольнай ліцэнзіяй, таксама распаўсюджваецца пад той жа ліцэнзіяй Творчых суполак.

Вы можаце паўторна выкарыстоўваць кантэнт, які ўтрымліваецца ў Вікіпедыі, у гэтым выпадку таксама неабходна, каб любое паўторнае выкарыстанне адпавядала згаданым ліцэнзіям. Тое ж самае тычыцца любых зменаў, дапаўненняў тэкстаў або іншага кантэнту.

Вы маеце магчымасць устаўляць тэкст, які знайшлі дзесьці яшчэ альбо напісалі ў суаўтарстве, але тады вы гарантуеце, што ён даступны на тых умовах, якія не пярэчаць ліцэнзіі **CC BY-SA** або **GNU FDL**.

Нятэкставыя медыяфайлы могуць быць даступныя і пад іншымі ліцэнзіямі, галоўнае, што яны прытрымліваюцца мэты дазволу неабмежаванага паўторнага выкарыстання і паўторнага распаўсюджвання. Памятайце аб гэтым, дадаючы нятэкставыя медыяфайлы.

Калі ласка, майце на ўвазе, што гэтыя ліцэнзіі дазваляюць камерцыйнае выкарыстанне вашага ўнёску.

І нарэшце, нават калі вы вырашылі ніколі больш не звяртацца да Вікіпедыі, згодна ліцэнзіяў вы абяцаеце, што не скасуеце ў аднабаковым парадку і не паспрабуеце зрабіць несапраўднай любую ліцэнзію, якую вы выдалі на свой тэкст альбо іншыя медыяфайлы ў Вікіпедыі.

Ёсць яшчэ кантэнт, які знаходзіцца ўжо ў **грамадскім набытку**, г. зн. што ён можа выкарыстоўвацца без дазволу праваўладальніка і без выплаты ўзнагароды. Дадавайце смела! Аднак вельмі важна, каб вы маглі пацвердзіць гэты факт.



Ліцэнзіі Творчых суполак
GFDL
Філія Творчых суполак у Беларусі

## Кантакты

ФАЛАНСТЭР

falanster.by

falanster.by@gmail.com

## Стваральнікі брашуры:

Svetit, Mr. Zabej, Renessaince, Lady Di~bewiki, Liashko, Хомелка, Da voli, Hannabaradzina, Zmicier Sauka, Надежда Бутович, Base, Maksim L., Belarus2578
@helaku, @czaroot, @romaiwanowa, @dinmoriarty, Ганна Лаўнiковiч, @ritrita0312, @darya_sikorskaya

# Партнёры

Вікіпедыя не мае нязменных правілаў.

Будзьце рашучымі ў рэдагаванні!

Гэта пяць самых важных слупоў Вікіпедыі!



BY SA

ФАЛАНСТЭР 2015

bit.ly/wiki-helper-be